НАША ПАМЯЦЬ

# Не пасаваў перад выпрабаваннямі

**Разам з усімі народамі Савецкага Саюза з гонарам выконвалі свой абавязак перад Радзімай і чалавецтвам беларусы. Яны ўдзельнічалі ў бітвах пад Брэстам, Масквой, Сталінградам, Курскам, у вызваленні Каўказа, Украіны, прыбалтыйскіх рэспублік, іншых краін, аддавалі сваё жыццё пры ўзяцці Берліна і штурме рубяжоў у Маньчжурыі і Карэі. За гады гераічнай барацьбы з ворагам нашы патрыёты ўнеслі неацэнны ўклад у Вялікую Перамогу. Сведкам і ўдзельнікам тых падзей з'яўляўся і Яўген Сцяпанавіч Чыркоўскі з вёскі Старасек.**



**Мужнага барацьбіта Яўгена Сцяпанавіча Чыркоўскага памятаюць яго аднавяскоўцы.**

Нарадзіўся ён у сялянскай шматдзетнай сям'і. Маленства прайшло ў няпростых умовах, рана давялося зведаць цану працы. Дапамагаў бацькам па гаспадарцы: касіў траву, пасвіў свіней, авечак, хадзіў за плугам, капаў бульбу. Асабліва часу на навуку не было, таму Яўген скончыў толькі пачатковую школу. А калі пачалася вайна, юнаку ішоў шаснаццаты год.

Успамінаючы той час пасля, наш зямляк казаў: «Дата 22 чэрвеня 1941-га стала днём памяці і смутку, адным з самых горкіх у сусветнай гісторыі, які павярнуў увесь яе ход, змяніў жыццё вялікай дзяржавы, зламаў лёсы мільёнам людзей. На нашу зямлю рушыла ўзброеная бязлітасная армада, якая не давала літасці нікому: ні старым, ні малым».

Нават падлеткам Чыркоўскі выдатна ўсведамляў, што нельга пасаваць перад ворагам. Як толькі арганізаваліся партызанскія атрады, юны вясковец стаў дапамагаць лясным воінам: падвозіў на коннай павозцы іх у Петрыкаў і Жыткавічы, дастаўляў прадукты харчавання на востраў Зыслаў, выконваў іншыя даручэнні. А ў маі 1943-га папоўніў атрад імя Я.Д. Гарбачова і пачаў спраўляцца з больш адказнымі заданнямі. Разам з іншымі мсціўцамі здзяйсняў дыверсіі супраць карнікаў, удзельнічаў у баявых аперацыях, хадзіў у разведку, праводзіў агітацыйную работу сярод насельніцтва. Партызаны пускалі пад адхон нямецкія эшалоны, падрывалі варожыя склады з боепрыпасамі і паліўнымі матэрыяламі, масты, па якіх гітлераўцы ажыццяўлялі ваенныя перавозкі...

«Падчас вызвалення Беларусі ад захопнікаў атрад імя Гарбачова ў складзе брыгады №25 імя Панамарэнкі злучыўся каля вёскі Засмужжа з Чырвонай Арміяй. Сустрэча гэта была цёплай і радаснай», – прыгадваў Яўген Чыркоўскі.

Пасля гэтага ён каля двух месяцаў рабіў у органах сацыяльнага забеспячэння. А ў пачатку восені 1944-га атрымаў накіраванне ў горад Кіраў Магілёўскай вобласці. Пасля месячнай падрыхтоўкі з размеркавальнага пункта трапіў на фронт, дзе чакалі жорсткія баі. Вакол узрываліся гранаты, амаль бесперапынна «стракаталі» кулямёты, на вачах гінулі людзі... Наш зямляк прымаў удзел у вызваленні польскіх гарадоў – Кракава, Дэмбліна, Варшавы. Потым яго баявы шлях ляжаў у напрамку Латвіі, затым – Літвы.

**Не раз давялося глядзець у вочы ворагу, але ён не з палахлівых. Нават у самыя жахлівыя моманты не страчваў упэўненасці, што немцы нарэшце не вытрымаюць ціску савецкіх салдат. І марыў пра той час, калі будзе ўзяты Берлін і ліхалецце закончыцца.**

Пасля пераможных салютаў Чыркоўскі прадоўжыў вайсковую службу ў Баку і Свярдлоўску. А дэмабілізаваўшыся напрыканцы 1951-га, Яўген Сцяпанавіч вярнуўся ў родныя мясціны. Неўзабаве пабраўся шлюбам з аднавяскоўкай Марыяй, якая працавала ў калгасе цялятніцай. Напачатку маладой сям'і давялося жыць у зямлянцы. Нават першы з трох сынкоў нарадзіўся ў такіх умовах. Але паступова жыццё наладжвалася, Чыркоўскія завяршылі будаўніцтва ўласнага дома, які стаў для іх па-сапраўднаму ўтульным гняздзечкам.

Яўген працаваў адразу ў мясцовай кузні ў Старасеку: каваў сярпы, падковы, плугі і іншыя неабходныя ў сельскай гаспадарцы прылады. Потым перайшоў на ферму. І ўжо да самага выхаду на заслужаны адпачынак быў заняты ў жывёлагадоўлі. Як расказваў, усё трэба было рабіць уручную: і стойлавыя месцы прыбіраць, і кармы раздаваць, і інш. Цяжка прыходзілася, але Чыркоўскі не з тых, хто пасаваў перад складанасцямі і выпрабаваннямі. Ён шчыраваў дбайна і самааддана, па-іншаму сумленне не дазваляла.

Не дзіўна, што і баявы, і працоўны шлях вяскоўца адзначаны шэрагам узнагарод: ордэнамі Айчыннай вайны II ступені і Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі «За баявыя заслугі», «За перамогу над Германіяй», «За баявую і працоўную доблесць» і іншымі.

**Рыгор ЛЯЎЧЭНЯ, настаўнік Соснаўскай СШ №2.**

# Не дзеля славы, а ў імя міру

**Любаншчына ўзрасціла шмат герояў. У іх ліку і Захар Лышчэня, подзвіг якога жыве ў памяці землякоў.**

Баявы шлях ўраджэнца вёскі Пласток пачаўся ў 1938 годзе з удзелу ў савецка-фінскай вайне. А ў верасні 1941-га ён далучыўся да барацьбы з фашысцкай навалай. Змагаўся мужна, адважна, не палохаўся ворага. Нездарма даволі хутка Лышчэню прызначылі камандзірам аддзялення разведкі. І ў гэтай якасці ён прайшоў амаль усю вайну.

**Прымаў удзел у найбольш кровапралітных баях: абараняў Сталінград, удзельнічаў у Курскай бітве, фарсіраваў Днепр, вызваляў Украіну, Польшчу. Але літаральна тры месяцы Захар Рыгоравіч не дажыў да перамогі, дзеля якой столькі рызыкаваў і пераадолеў.**

У лютым 1945-га яго дывізія вяла цяжкія баі каля сучаснага польскага Вроцлава. І камандзір атрымаў заданне трапіць у размяшчэнне праціўніка ў пасёлку Цотвіц, каб максімальна сабраць дадзеныя пра яго сілы, размяшчэнне агнявых кропак. Ноччу з 7-га на 8-е разведгрупа на чале з гвардыі старшынёй Лышчэнем накіравалася ў тыл ворага. Вайскоўцы паспяхова выканалі заданне, уведалі неабходную інфармацыю, а калі вярталіся, іх заўважылі карнікі. Пачалася перастрэлка. Наш зямляк страляў з аўтамата кароткімі чэргамі, адзін за другім падалі нямецкія салдаты. Аднак раптам і сам адчуў пякучы боль: напаткала варожая куля і параніла. Адразу ж на дапамогу прыйшоў разведчык. Старшына перадаў яму атрыманыя звесткі і загадаў даставіць камандзіру батарэі. А сам застаўся затрымаць акупантаў.



**Наш зямляк (злева) прайшоў гераічны шлях і спаўна выканаў свой грамадзянскі абавязак перад Радзімай.**




**Не зарастае сцяжынка да помніка Захару Лышчэні, устаноўленаму ў в. Пласток.**

Але доўга не змог трымаць абарону. Хутка яго, абяссіленага, схапілі фашысты і ўчынілі зверскую расправу. Здзекаваліся з яго, ды не спалохалі мужнага чырвонаармейца: ён не прамовіў ні слова. Толькі ўсміхнуўся, калі пачуў залп роднай батарэі. Зразумеў: баявыя сябры атрымалі разведдадзеныя...

Калі населены пункт быў вызвалены ад гітлераўцаў, баявыя таварышы знайшлі свайго камандзіра і годна яго пахавалі. А пасля ліхалецця Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Захару Лышчэні пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго імя навечна занесена ў спісы 43-га гвардзейскага артылерыйскага палка, у якім ён ваяваў камандзірам аддзялення разведкі. Але не дзеля славы ваяваў наш зямляк, а ў імя міру ў краіне і для нашчадкаў.

**Наталля ВІЛЕНТА.**